# XIII ГЛОБАЛЬНЫЕ НАУКИ

## И ИННОВАЦИИ 2021: ЦЕНТРАЛЬНАЯ АЗИЯ



**МЕЖДУНАРОДНЫЙ НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКИЙ ЖУРНАЛ**

---

Нур-Султан, Казахстан

## ОБЪЕДИНЕНИЕ ЮРИДИЧЕСКИХ ЛИЦ В ФОРМЕ АССОЦИАЦИИ «ОБЩЕНАЦИОНАЛЬНОЕ ДВИЖЕНИЕ «БОБЕК» КОНГРЕСС УЧЕНЫХ КАЗАХСТАНА

ISSN 2664-2271

# «ГЛОБАЛЬНАЯ НАУКА И ИННОВАЦИЯ 2021: ЦЕНТРАЛЬНАЯ АЗИЯ»

№ 2(13). ИЮНЬ 2021
СЕРИЯ «ПЕДАГОГИЧЕСКИЕ НАУКИ»
Журнал основан в 2018 г.

I ТОМ

**ГЛАВНЫЙ РЕДАКТОР:**
**Ж.Малибек, профессор;**
**Ж.Н.Калиев к.п.н.;**
**Лю Дэмин (Китай),**
**Е.Л. Стычева, Т.Г. Борисов (Россия)**
**Чембарисов Э.И. д.г.н., профессора (Узбекистан)**
**Салимова Б.Д. к.т.н., доцент (Узбекистан)**
**Худайкулов Р.М. PhD (Узбекистан)**
**Заместители главного редактора: Е. Ешім, Е. Абиев (Казахстан)**

© ОЮЛ в форме ассоциации
«Общенациональное движение «Бобек», 2021

НУР-СУЛТАН – 2021

CONSOLIDATION OF LEGAL ENTITIES IN THE FORM OF AN ASSOCIATION «NATIONAL MOVEMENT «BOBEK» CONGRESS OF SCIENTISTS OF KAZAKHSTAN

ISSN 2664-2271

# «GLOBAL SCIENCE AND INNOVATIONS 2021: CENTRAL ASIA»

No. 2(13). June 2021
SERIES «PEDAGOGICAL SCIENCES»
The journal was founded in 2018.

I VOLUME

**CHIEF EDITOR:**
**J. Malibek, professor;**
**Zh.N. Kaliev, candidate of pedagogical sciences;**
**Liu Deming (China),**
**E.L. Stycheva, T.G. Borisov (Russia)**
**Chembarisov E.I. Doctor of Geographical Sciences, Professor (Uzbekistan)**
**Salimova B.D. Ph.D., associate professor (Uzbekistan)**
**Khudaykulov R.M. PhD (Uzbekistan)**
**Deputy chief editors: Y. Yeshim, E. Abiev (Kazakhstan)**

NUR-SULTAN – 2021

Consolidation of legal entities in the form of an association «National Movement «Bobek», 2021

**УДК 373.31**

# ІНТЭРАКТЫЎНЫ МЕТАД «30 СЕКУНД МАЎЛЕННЯ» НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў І КЛАСЕ

**Шылава Алена Савельеўна**
Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі БДПУ ім. М. Танка,
**Мурашка Наталля Уладзіміраўна**
Магістар, настаўнік пачатковых класаў ДУА «СШ № 196 г. Мінска»
Мінск, Рэспубліка Беларусь

***Анатацыя:*** *праблема фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў навучэнцаў I–IV класаў на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі выклікае неабходнасць пошуку і ўкаранення новых падыходаў, якія б спрыялі эфектыўнаму засваенню ведаў і забяспечвалі дасягненне загадзя спраектаваных вынікаў на аснове ўзаемадзеяння суб'ектаў дзейнасці.*

***Ключавыя словы:*** *маўленча-камунікатыўная кампетэнцыя, інтэрактыўны метад «30 секунд маўлення».*

Фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі ў навучэнцаў I–IV класаў з'яўляецца актуальнай праблемай у сучаснай педагагічнай практыцы.

У працэсе фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі можна вылучыць некалькі этапаў:

- развіццё слоўнікавага запасу;
- фарміраванне звязнага маўленння;
- фарміраванне камунікатыўных уменняў.

Адным з асноўных і першапачатковых этапаў фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі з'яўляецца развіццё слоўнікавага запасу. На гэтым этапе неабходна прывесці навучэнцаў да разумення значэння слоў, уяўленняў аб тым, што азначае дадзенае слова і ў якіх сітуацыях яго магчыма ўжываць.

Курс беларускай мовы ў I класе агульнаадукацыйных школ з рускай мовай навучання з'яўляецца вусным, у аснове якога прадугледжанна ўзбагачэнне і назапашванне слоўнікавага запасу і фарміраванне камунікатыўных уменняў і навыкаў навучэнцаў па вызначаных у вучэбнай праграме тэмах. У сувязі з гэтым мэтазгодна ўрокі замацавання, абагульнення і сістэматызацыі ведаў праводзіць з выкарыстаннем інтэрактыўнага метаду, які мы назвалі «30 секунд маўлення» [1]. У літаратуры гэты метад часцей называюць «Хвіліна маўлення» [2], які мы адаптавалі для прымянення з навучэнцамі I–IV класаў на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Мэта правядзення гэтага метаду заключаецца ў:

- абагульненні і сістэматызацыі тэарэтычных ведаў, якія вучні вывучалі на працягу навучальнага года;
- фарміраванні уменняў коратка і выразна выступаць па зададзенай тэме на працягу 30 секунд;
- самаправерцы і самаацэнцы засвоеных ведаў;
- развіцці навыкаў ацэньвання.

Пакажам магчымасці рэалізацыі гэтага метаду на ўроке беларускай мовы ў I класе па тэме «Я і мая мова» [3].

Для правядзення гэтага метаду настаўніку неабходна падрыхтаваць спецыяльнае абсталяванне: бланк ацэнкі вынікаў праверкі ведаў (колькасць бланкаў адпавядае колькасці навучэнцаў класа), таймер, ручкі.

Разгледзім этапы рэалізацыі метаду.

**Першы этап (падрыхтоўчы).**

1) Настаўнік паведамляе навучэнцам, што сёння на ўроку яны будуць ацэньваць тэарэтычныя веды сваіх сяброў, якія атрымалі на працягу навучальнага года; складае пералік тэм, якія і фіксуюцца на дошцы або слайдзе. Колькасць тэм павінна адпавядаць колькасці навучэнцаў класа і кожная тэма павінна мець свой нумар. Для абранага намі ўроку пералік тэм, згодна з праграмай па прадмету «Беларуская мова» [3], можа быць наступным:

№ 1. Назвы транспарту.
№ 2. Назвы школьных памяшканняў.
№ 3. Назвы ягад.
№ 4. Назвы школьных рэчаў.
№ 5. Назвы агародніны.
№ 6. Назвы жывёл.
№ 7. Назвы птушак.
№ 8. Назвы кветак.
№ 9. Назвы мэблі.
№ 10. Назвы з’яў прыроды.
№ 11. Назвы жаночага адзення.
№ 12. Назвы беларускага традыцыйнага адзення.
№ 13. Назвы садавіны.
№ 14. Назвы абутку.
№ 15. Назвы харчовых прадуктаў.
№ 16. Назвы частак дома.
№ 17. Назвы паштовых рэчаў.
№ 18. Назвы хатніх рэчаў.
№ 19. Назвы навакольнага асяроддзя.
№ 20. Назвы прафесій.
№ 21. Назвы мужчынскага адзення.
№ 22. Назвы сімвалаў Беларусі.
№ 23. Назвы дзяржаўных святаў.
№ 24. Назвы народных святаў.
№ 25. Назвы сваякоў.
№ 26. Ветлівыя словы.
№ 27. Назвы гарадскіх рэчаў.

*У залежнасці ад колькасці навучэнцаў у класе настаўнік па сваім меркаванні можа сам падабраць неабходную колькасць тэм (заданняў, пытанняў), а таксама абавязкова ўключыць тыя, пры выкананні якіх большасць навучэнцаў дапускаюць памылкі ці веданне якіх не засвоена на дастатковым узроўні.*

2) Кожнаму вучню настаўнік раздае бланк ацэнкі вынікаў праверкі ведаў з прозвішчамі ўсіх навучэнцаў класа, у якім кожны вучань павінен ацаніць выступленні іншых, запоўніць бланк і выставіць адпаведныя балы:

- ✓ правільны адказ – 2 балы;
- ✓ адказ з памылкамі – 1 бал;
- ✓ адсутнасць адказу – 0 балаў.

Бланк ацэнкі вынікаў праверкі ведаў навучэнцаў прадстаўлены ў табліцы 1.

Табліца 1. – Фрагмент бланка ацэнкі вынікаў праверкі ведаў навучэнцаў

| № | Прозвішча навучэнца | Правільны адказ за 30 секунд 2 бала | Адказ з памылкамі 1 бал | Адсутнасць адказу 0 балаў |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Іваноў С. | | | |
| 2. | Пятроў Т. | | | |
| 3. | Сідараў К. | | | |
| і г.д. | | | | |

3) Настаўнік тлумачыць навучэнцам, што нумар Прозвішча ў бланку будзе адпавядаць нумару тэмы на слайдзе (альбо дошцы) і кожны з іх павінен будзе адказаць па сваёй тэме на працягу 30 секунд.

***Настаўнік.*** Давайце праверым, ці правільна вы зразумелі што трэба зрабіць.

– Паглядзіце на бланк ацэнкі вынікаў праверкі ведаў і знайдзіце пад якім нумарам запісана ваша прозвішча.

***Вучань.*** Маё прозвішча ў бланку запісана пад нумарам 1.

***Вучань.*** Маё пад нумарам 9.

***Вучань.*** А маё – пад нумарам 20.

***Настаўнік.*** На якую тэму (заданне, пытанне) кожнаму з вас трэба будзе падрыхтаваць адказ? Пакажыце нумар сваёй тэмы (задання, пытання) і прачытайце яго.

***Вучань.*** У мяне будзе тэма № 1. «Назвы транспарту». Я павінен буду назваць па-беларуску ўсе назвы транспарту, якія я ведаю.

***Вучань.*** Мая тэма № 9. «Назвы мэблі». А калі я забыўся?

***Вучань.*** Мая тэма № 20. «Назвы прафесій». Гэта лёгка, я ведаю.

***Настаўнік.*** Калі вы прачыталі сваю тэму і разумееце, што не можаце даць адказаць (забыліся словы), не хвалюйцеся, я дам вам час для таго, каб вы паўтарылі і ўспомнілі.

– За які час вы павінны даць адказ?

***Вучань***. Трэба будзе адказаць за 30 секунд.

***Вучань.*** Але гэта часу мала.

***Вучань.*** Мы не паспеем.

***Настаўнік***. Давайце праверым, колькі слоў мы паспеем сказаць за 30 секунд.

*Настаўнік выклікае двух вучняў да дошкі, аднаму з іх дае секундамер, другому – таймер.*

– Давайце ўсе разам хорам палічым да 30, а Марк, калі пройдзе 30 секунд, павінен нас спыніць. Каб Марк не памыліўся, яго будзе падстрахоўваць Аліна,у якой таймер зазвініць праз 30 секунд.

*Вучні разам з настаўнікам лічаць да таго часу, пакуль Марк не дасць каманду спыніцца і не загучыць званок таймера ў Аліны.*

– Да скалькі мы паспелі з вамі далічыць?

***Вучань.*** Да 28.

***Вучань.*** Мы лічылі павольна, можна хутчэй.

***Настаўнік.*** Правільна, шмат можна расказаць за 30 секунд. Чалавек, які вельмі добра ведае матэрыял, усё паспее зрабіць. Некаторыя з вас адкажуць яшчэ хутчэй.

***Настаўнік.*** Давайце праверым, ці памятаеце вы, якія балы вы павінны паставіць за адказ вучню супраць яго прозвішча ў бланку.

***Вучань.*** За правільны адказ мы павінны паставіць 2 балы.

***Вучань.*** 2 балы ставім, калі паспеў адказаць за 30 секунд.

***Вучань.*** Калі адказ быў не зусім правільны, ставім 1 бал.

***Вучань.*** Калі забыўся словы, не змог адказаць, ставім 0 балаў.
***Вучань.*** Давайце, калі вучань адказаў хутчэй, чым за 30 секунд, будзем ставіць яму 3 балы.
***Настаўнік.*** Я ўпэўнена, што вы ўсе добра засвоілі пройдзены матэрыял і будзеце паспяваць даваць правільны адказ за 30 секунд.

**Другі этап. Індывідуальная праца.**

Навучэнцы прыступаюць да падрыхтоўкі свайго выступлення (час на падрыхтоўку – 2 хвіліны).
Кожны вучань атрымлівае заданні:
✓ паўтарыць неабходныя словы;
✓ патрэніравацца коратка і выразна ў працягу 30 секунд прагаварыць словы па сваёй тэме.

Індывідуальная праца адбываецца наступным чынам:

1) навучэнцы самастойна паўтараюць неабходныя словы. Калі ў іх узнікаюць цяжкасці, яны маюць права карыстацца сваім асабістым тэматычным ілюстрацыйным слоўнікам. Кожны вучань павінен знайсці ў слоўніку неабходны матэрыял і паўтарыць яго;

2) кожны вучань трэніруецца, неаднаразова паўтарае словы па сваёй тэме, каб на працягу 30 секунд паспець правільна іх прагаварыць.

**Трэці этап. Праца ў парах.**

Навучэнцам, якія працуюць у парах са сваім суседам па парце, прапануецца наступнае заданне: праверыць у свайго суседа ці паспее ён за 30 секунд прагаварыць свае словы. Калі хто-небудзь з вучняў дапускае памылкі, то сусед выпраўляе іх, а калі хто-то не паспявае прагаварыць за 30 секунд, яны сумесна абмяркоўваюць, якія словы можна скараціць, каб адказаць за гэты час. Для гэтага па камандзе настаўнікі вучні пачынаюць адказваць і па званку таймера спыняюцца.

**Чацвёрты этап. Выступленне навучэнцаў класа ў адпаведнасці з парадкавымі нумарамі.**

1) Навучэнцы класа пачынаюць па чарзе выступаць у адпаведнасці з сваімі парадкавымі нумарамі. Настаўнік фіксуе час выступлення з дапамогай таймера: 30 секунд. Па званку таймера вучань спыняецца.

***Вучань.*** Я ведаю шмат назваў транспарту па-беларуску: аўтамабіль – раз, трамвай – два, тралейбус – тры, метро – чатыры, электробус – пяць, матацыкл – шэсць, аўтобус – сем, веласіпед – восем, самалёт – дзевяць,  цягнік – дзесяць, таксі – адзінаццаць.

*(Званок таймера.)*

***Вучань.*** Я ведаю шмат назваў школьных памяшканняў па-беларуску: клас – раз, лесвіца – два, спартыўная зала – тры, калідор – чатыры, актавая зала – пяць, сталовая – шэсць, бібліятэка – сем, гардэроб – восем.

*(Званок таймера.)*

***Вучань.*** Я ведаю шмат назваў ягад па-беларуску: суніцы – раз, чарніцы – два, буякі – тры, ажыны – чатыры, агрэст – пяць, парэчка – шэсць, шыпшына – сем, журавіны – восем, брусніцы – дзевяць,  клубніка – дзесяць.

*(Званок таймера і г.д.)*

2) Усе астатнія вучні класа ацэньваюць выступленні сваіх аднакласнікаў, запаўняюць бланкі ацэнкі вынікаў праверкі ведаў, выстаўляюць балы: правільны адказ за 30 секунд – 2 балы; адказ з недакладнасцямі – 1 бал; адсутнасць адказу – 0 балаў.
3) Кожны навучэнцаў здае запоўнены бланк настаўніку.
4) Настаўнік прапануе навучэнцам выканаць самастойную працу, а ў гэты час, праглядаючы бланкі ацэнкі вынікаў праверкі ведаў кожнага вучня, выяўляе тыя пытанні, якія выклікалі цяжкасці.

**Пяты этап. Падвядзенне вынікаў.**

1) Настаўнік апавяшчае спіс пытанняў, у якіх у навучэнцаў класа з'явіліся цяжкасці, запісвае іх на дошцы і арганізуе парную працу суседзяў па парце, каб яшчэ раз паўтарыць і замацаваць іх.
2) Настаўнік арганізуе франтальную працу ў класе, задае пытанні вучням, у якіх ўзнікалі цяжкасці.

**Настаўнік:** Мне вельмі спадабалася, як вы працавалі:
✓ паўтарылі ўсе словы;
✓ патрэніраваліся коратка і выразна на працягу 30 секунд прагаварыць словы па тэме;
✓ праверылі ў свайго суседа па парце ці паспее ён за 30 секунд адказаць;
✓ паказалі недакладнасці ў адказах адзін аднаго і сумесна абмеркавалі, якія словы можна скараціць, каб паспець адказаць за 30 секунд;
✓ кожны з вас па чарзе выступіў у адпаведнасці са сваім парадкавым нумарам;
✓ кожны з вас ацаніў выступленні сваіх аднакласнікаў, запоўніў бланкі ацэнкі вынікаў праверкі ведаў;
✓ з суседам па парце яшчэ раз паўтарылі і замацавалі пытанні, якія выклікалі цяжкасці ў вучняў;
✓ вучні, у якіх ўзнікалі цяжкасці пры адказах, паспрабавалі выправіць свае памылкі і даць правільныя адказы.

**Шосты этап. Рэфлексія.**

Настаўнік прапануе пытанні для абмеркавання:
• Ці спадабаўся вам метад «30 секунд маўлення»?
• Ці адчувалі вы цяжкасці ў падрыхтоўцы адказа за 30 секунд?
• Ці ўдалося прагаварыць сваю тэму за адведзены час?
• Ці спадабалася вам правяраць веды сваіх сяброў?
• Ці цяжка вам было запаўняць бланк ацэнкі вынікаў праверкі ведаў?
• Ці спадабалася вам такая праца?
• Ці задаволеныя вы сабой і сваімі вынікамі?
• Што ў вас выклікала найбольшыя цяжкасці?
• Што неабходна пажадаць вучням, якія не паспелі прагаварыць словы за адведзены час?
• Што неабходна пажадаць вучням, якія дапусцілі недакладнасці ў пад час свайго выступлення?

Выкарыстанне інтэрактыўнага метаду «30 секунд маўлення» на ўроках беларускай мовы ў I класе дазваляе трывала засвоіць лексічны матэрыял, навучыцца даваць выразны адказ на пытанне за кароткі прамежак часу, развіваць ўменне ўважліва слухаць адказы сваіх сяброў, параўноўваць іх са сваімі адказамі, а таксама ацэньваць іх, фарміраваць камунікатыўныя уменні і навыкаў навучэнцаў, фарміраваць уменне выстаўляць неабходныя балы ў адпаведнасці з названымі крытэрамі і запаўняць бланк ацэнкі вынікаў праверкі ведаў.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ:

1. Шилова, Е. С. Технология реализации интерактивного метода «30 секунд говорения» на уроках математики в III классе / Е. С. Шилова // Пачатковае навучанне: сям'я, дзіцячы сад, школа. – 2021. – № 5. – С. 11–13.
2. Интенсивное обучение: организация контроля знаний и умений обучающихся: практическое руководство / И. В. Шеститко [и др.]; рец. В. В. Чечет. – Светлая Роща : ИППК МЧС Респ. Беларусь, 2014. – 75 с.
3. Учебные программы по учебным предметам для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания: 1 класс / М-во образования Респ. Беларусь. – Минск : Нац. ин-т образования, 2017. – 195 с.